ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
22 11 2018 г.

SEX-БАЛЯСЫ

# СПЫТАЙЦЕ Ў ДАРВІНА

**«Смерць забірае самых лепшых. Таму я ўзмоцнена дэградую апошнія некалькі гадоў». Не ведаю, як вам, а мне ў галаву прыходзіць найперш гэты анекдот, калі я чытаю некаторыя заходнія навіны адносна гендара. («Хопіць пужаць усіх канцом свету. Гэта нікога не палохае. Напужайце ўсіх канцом інтэрнэту».) Якія там дамаганні да знакамітасцяў? Якія даследаванні брытанскіх вучоных? Гэта ўсё дзіцячы лепет у параўнанні з тым, што творыцца ў галовах звычайных, падавалася б, людзей!.. Можа, яны сапраўды нешта ведаюць і спрабуюць так выжыць? («— Я тут грэшнай справай падумаў... — Галавой трэба было думаць!») Бо іншых тлумачэнняў таго, што адбываецца, я назваць не магу, хоць вельмі хацелася б. («— Доктар, я ж не стары, мне толькі 22 гады. Мае сябры ходзяць у клубы і тырчаць там да ранку, а мне гэта нецікава. Што са мной не так? — Нічога страшнага, проста ў вас ёсць мазгі».) Ну вось уявіце сабе: у ЗША некалькі студэнтаў сарвалі лекцыю пра гендарную разнастайнасць з-за слоў прафесара біялогіі аб адрозненнях паміж... мужчынамі і жанчынамі. Без жартаў...**

Спецыяліст адзначыла, што лічыць дзіўнай пазіцыю, калі сцвярджаецца, быццам біялагічны пол чалавека, як і паняцце гендара (успрыняцце пола) можа змяніцца падчас эвалюцыі. Чытачы, вы ў гэта верыце? Ці пад «эвалюцыяй» некаторыя маюць на ўвазе нешта зусім іншае? («Чым добры наш час: калі не атрымаецца ўдала жаніцца, дык можна паспрабаваць выйсці замуж».) Няўжо ў кагосьці тут ёсць нейкія сумненні? («У вас ніколі не збываюцца гараскопы? Значыць, бацькі манілі вам пра дату нараджэння, а тое і ўвогуле купілі вас у цыган».) Прафесар заявіла, што анатомія і фізіялогія мужчын і жанчын адрозніваецца незалежна ад таго, што думаюць пра гэта ў грамадстве. Няўжо гэта раней не было вядома? («Калі б крэмы ад маршчын рэальна дапамагалі, дык у жанчын ужо не было б адбіткаў пальцаў».) Што ў процілеглых полаў розны рост, аб'ём мышачнай масы, па-рознаму адкладваецца тлушч. («— Фіма, ты памятаеш, што пры награванні цела расшыраецца? — Так, і што з таго? — Дык значыць, я не тоўстая, а проста страшэнна гарачая!») І мозг у мужчын і жанчын працуе таксама па-рознаму, дадала біёлаг. («Не жаніцеся з высокімі дзяўчатамі. На іх футра даражэй каштуе...»)



Што тут пачалося! («Глядзі доранаму каню ў зубы. Выкінь слова з песні. Зрабі слова вераб'ём. Намаж «дзякуй» на хлеб. Без высілкаў выцягні рыбку з сажалкі. Ідзі супраць сістэмы».) Некалькі студэнтаў учынілі скандал, вывелі са строю аўдыясістэму і пад наглядам паліцыі пакінулі аўдыторыю. Напрыканцы кінуўшы прафесару фразу пра яе «прамытыя мазгі». Як вам такое? («Як казала цётка Цыля, «самы страшны від беспрацоўя — галава, якая не працуе».) Трэба аддаць належнае, пасля гэтага круглы стол прадоўжыўся і словы лектара ў зале падтрымалі бурнымі апладысментамі. Ну, значыць, не ўсё яшчэ згублена... («— Вучоныя знайшлі новы спосаб зачацця. — А чым стары не падабаецца?»)

Яшчэ больш дзікунскі выпадак, на мой погляд, адбыўся ў Вялікабрытаніі. Там студэнта з Кіпра выключылі з універсітэта за твіт пра тое, што ў жанчын няма... Увага, засяродзьцеся, набярыце ў грудзі болей паветра... Чаго няма? Усё роўна не здагадаецеся. («З дзяўчатамі заўсёды так: прыстаеш — нахабнік, не прыстаеш — прыдурак».) Ну, таго самага мужчынскага палавога органа, малюнак якога раней быў у кожным папяровым падручніку па анатоміі. А анатомія, нагадаў бы тым «разумнікам», гэта навука. («Я настолькі стары, што памятаю часы, калі Сабчак і Клінтан былі мужыкамі».) Ты-ы-д-ым! Я зараз паспрабую адгадаць: вы плачаце альбо смеяцеся? Іншае? («Слоўнікавы запас фізрука на 70 працэнтаў складаецца са свісту».) Дык вось, за сцвярджэнне відавочнага хлопца не толькі выключылі з універсітэта, але і звольнілі з пасады рэдактара студэнцкага часопіса і прэзідэнта студэнцкай супольнасці за свабоду слова. Апошняе — гэта, пагадзіцеся, увогуле супер! Але і тут яшчэ не ўсё! На ўжо колішняга студэнта так «наехалі» прадстаўнікі сексуальных меншасцяў, што той мусіў не толькі выдаліць свой твіт, прынесці прабачэнні, але і заявіць, што... Так, канешне ж, жанчыны могуць мець той самы орган... (Памятаеце эпізод з фільма «Добры дзень, я ваша цёця»? «— Што вам трэба, сэр? — Ты што, з глузду з'ехаў?! Які я табе сэр?») Дадаць больш няма чаго. Заслона. Нямая сцэна...

Нядаўна майстар адзінаборстваў, а цяпер амерыканскі радыёвядучы заявіў на ўсю краіну пра тое, што рускія — гэта апошнія мужыкі, якія засталіся на Зямлі, у прамым сэнсе слоў. Думаю, пад рускімі можна разумець усіх прадстаўнікоў дужай паловы чалавецтва некалі адзінай вялікай краіны. Дык вось, каментуючы сітуацыю, радыёвядучы сказаў, што «ў ЗША ўсе сталі нейкімі жанчынападобнымі, яшчэ крыху — і мужыкі пачнуць насіць шпількі і фарбавацца... Рускія не любяць, калі ім указваюць, гэта апошнія мужыкі на Зямлі. Нам трэба браць з іх прыклад».

...Дык а пры чым тут Дарвін? Як вядома, галоўны (хоць і не адзіны) фактар эвалюцыі, згодна з яго вучэннем, — натуральны адбор. «Дарвін быў мудрым чалавекам, ён даў нам магчымасць хоць бы неяк тлумачыць нашы ідыёцкія ўчынкі».

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «АДЗІН ГОЛАС ДОБРА, А ДВА — ЯШЧЭ ЛЕПШ!»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Ці адразу ўдалося знайсці агульную мову ў дуэце?***

**Марк Войтка:**

— Так, бо мы даўно сябравалі. Упершыню сустрэліся, калі нам было па 15 гадоў. Рэжысёр Ніна Віктараўна Осіпава рыхтавала канцэрт да Дня Незалежнасці ў Палацы Рэспублікі, мы ўдзельнічалі ў агульным нумары, выконвалі песню «Беларусь». А потым разам паехалі на фэст у Анапу. Пазней дамовіліся паступаць на «эстрадны вакал» у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, трапілі ў адну групу, разам вучыліся. Рознагалоссі, вядома ж, бываюць, але мы заўсёды прыходзім да агульнага меркавання. У мужчынскіх калектывах з гэтым прасцей, як нам здаецца, чым у жаночых. Там і кнопкі падкласці ў туфлі могуць, і сукенку парэзаць. *(Смяюцца.)* Але калі сур'ёзна, то ў нашых гарачых спрэчках, якія часам успыхваюць з-за рэпертуару, касцюмаў ды іншых пытанняў, апошняе слова ўсё роўна застаецца за прадзюсарам.

***— Не шкадуеце, што выступаеце ў групе, а не ў ролях сольных выканаўцаў?***

**Марк Войтка:**

— Кожны з нас, вядома ж, марыў спяваць на прафесійнай сцэне. Мы да гэтага ішлі і былі ўпэўненыя, што ў нас усё атрымаецца. А тое, што сталі дуэтам, магчыма, нават і цудоўна. Ведаеце, адзін голас добра, а два яшчэ лепш! Як складзецца далейшы лёс гурта, цяжка зараз прагназаваць, але ў нас было некалькі выступленняў, калі адзін з салістаў хварэў, а другому прыходзілася адказваць за дваіх. Дык вось, выходзячы на сцэну, кожны па звычцы ўсё роўна зрушваўся направа або налева, як бы пакідаючы месца для другога, а не выходзіў адразу ў цэнтр сцэны. *(Смяюцца.)*

***— Вы часта гастралюеце?***

**Арцём Саладуха:**

— Так. І кожная пляцоўка для выступленняў у нас па-свойму любімая. У кожным месцы знаходзім нешта сваё, такое цёплае і роднае. Але па-асабліваму нас сустракаюць у Салігорску. Дарэчы, выступаем мы не толькі ў межах Беларусі, былі ў Кіеве, Сочы, Растове-на-Доне, Таганрогу, Новачаркаску, Шахтах, Азове і ў іншых гарадах.

***— Ці ў многіх конкурсах ужо прымалі ўдзел?***

**Марк Войтка:**

— Паколькі мы яшчэ даволі маладры музычны гурт, то нам здаецца, што іх было дастаткова. Вядома, самае запамінальнае — гэта адборы на «Еўрабачанне». Але цяпер мы практычна не ўдзельнічаем у конкурсах, затое выступаем на вялікіх фестывалях. Найбольш значнымі для нас былі «Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў», фестываль «Моладзь — за Саюзную дзяржаву», ну і, вядома ж, «Славянскі базар».



***— Для каго складаней спяваць — для дзяцей ці дарослых?***

**Арцём Саладуха:**

— Мы рады выступаць перад любой публікай. Галоўнае — гэта адчуваць аддачу ад залы. А для дзяцей, напрыклад, мы спявалі ў розных летніках, у нацыянальным дзіцячым цэнтры «Зубраня». Часта прымаем удзел у дабрачынных марафонах. У той жа час наша творчасць запатрабавана і івэнт-агенцтвамі на карпаратыўных мерапрыемствах.

***— Хто аўтар вашых песень?***

**Марк Войтка:**

— Першыя напісаў наш прадзюсар Анатоль Чэпікаў, але з нядаўняга часу кола аўтараў значна пашырылася. Зараз у нашым рэпертуары песні аўтараў з Расіі, Украіны, Беларусі. Дарэчы, пры ўсёй разнастайнасці кампазіцый у нас ёсць фаварытка, гэта песня «Я падвышаю градус», на дадзеным этапе яна наша любімая.

**«Рознагалоссі, вядома ж, бываюць, але мы заўсёды прыходзім да агульнага меркавання. У мужчынскіх калектывах з гэтым прасцей, як нам здаецца».**

***— Творчая прафесія мае на ўвазе ненармаваны працоўны дзень. Скажыце, ці шмат часу ў вас займаюць рэпетыцыі?***

***Арцём Саладуха:***

— Вы маеце рацыю, у творчай прафесіі не можа быць пэўнага працоўнага графіка. Музычную праграму звычайна адточваем два ці тры разы на тыдзень. А ў вольны ад працы час мы абмяркоўваем планы, розныя ідэі, будучыя праекты.

***— Ці ёсць нейкія хобі акрамя музыкі?***

**Марк Войтка:**

— Ну, музыка — гэта для нас не проста хобі... А што датычыца вольнага часу, то мы вядзём і прапагандуем здаровы лад жыцця. Акрамя гэтага, я, напрыклад, гуляю ў футбол, а вось Арцём цікавіцца дызайнам адзення. Наогул, мы досыць рознабаковыя асобы і заўсёды гатовыя адкрываць для сябе нешта новае!

***— Вы — прымхлівыя хлопцы? Можа, у вас ёсць талісман для паспяховых выступленняў?***

**Марк Войтка:**

— Наконт забабонаў нешта цяжка сказаць... У фінале «Еўрабачання» выступалі пад 13-м нумарам, і ў нас хапала непрыемнасцяў. Напрыклад, у мяне ў вуху адключыўся мікрафон. За тыдзень да фіналу ў Арцёма выявілі вузел на звязках, а ў мяне — ацёк. Нават не ведаем, містыка гэта ці проста няўдалы збег абставін. А вось талісман у нас ёсць, але пра яго ніхто і ніколі не даведаецца. Гэта наш сакрэт!

***— Як ставіцеся да крытыкі? Яна загартоўвае вас ці, наадварот, збівае са шляху?***

**Арцём Саладуха:**

— Часта чытаем каментарыі пра нас і нашу творчасць у розных сацыяльных сетках. Крытыку мы любім, але паважліва ставімся толькі да канструктыўнай. Вядома, калі яна такая, праводзім работу над сваімі памылкамі.

***— У вас ёсць куміры?***

**Арцём Саладуха:**

— Няма. Мы робім сваю музыку, укладваем у яе свае пачуцці і шукаем менавіта свайго гледача. Хочам быць ва ўсім індывідуальнымі.

***— Вы ўжо, напэўна, ведаеце, што будучае жыццё будзе звязана з музыкай?***

**Арцём Саладуха:**

— Так! Мы з дзяцінства займаемся ёю і ўжо не ўяўляем сябе без музыкі! Вядома, плануем развівацца, каб радаваць слухачоў новымі хітамі.

***— Што вы можаце сказаць адзін пра аднаго?***

**Разам:** — Ну што... Мы сябры, і гэтым усё сказана!

**Ангеліна НОВІКАВА,**
**студэнтка II курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 21.11.2018 г.